Журнал Белорусского государственного университета. Филология. 2022;1:30–39
Journal of the Belarusian State University. Philology. 2022;1:30–39

*УДК 811.161.3'0'373.45*

# ГЕРМАНИЗМЫ В СТАРОБЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ НА ФОНЕ СТАРОПОЛЬСКОГО ЯЗЫКА И ИХ ОТРАЖЕНИЕ В СТАРОУКРАИНСКОМ И СТАРОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

***Н. Г. ПРИГОДИЧ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Исследуются исконные германизмы, которые заимствовались старобелорусским языком на протяжении XIV–XVIII вв. как непосредственно из германских языков, так и через старопольский язык, приводятся параллели соответствующих единиц в староукраинском и старорусском языках. Исходя из предварительных результатов международного проекта «Мигрирующие слова: пути немецких заимствований из польского в восточнославянские языки» (руководитель – профессор Ольденбургского университета имени Карла фон Осецкого Герд Хентшель), определяются количественные и временные параметры заимствования таких слов, их распространение в памятниках старобелорусской письменности на материале картотеки и непосредственно 37 выпусков издания «Гістарычны слоўнік беларускай мовы». Обращается внимание на возможность заимствования германизмов старорусским языком через посредничество старобелорусского языка, указывается на необходимость дальнейшего исследования места и роли германизмов в лексическом составе современного белорусского литературного языка в связи с подготовкой многотомного издания нового толкового словаря.

***Ключевые слова:*** старобелорусский язык; межъязыковые контакты; германизмы; прямое заимствование; старопольский язык; староукраинский язык; старорусский язык; иноязычные заимствования в современном белорусском литературном языке.

# ГЕРМАНІЗМЫ Ў СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЕ НА ФОНЕ СТАРАПОЛЬСКАЙ МОВЫ І ІХ АДЛЮСТРАВАННЕ Ў СТАРАЎКРАІНСКАЙ І СТАРАРУСКАЙ МОВАХ

***М. Р. ПРЫГОДЗІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Даследуюцца спрадвечныя германізмы, якія запазычваліся старабеларускай мовай на працягу XIV–XVIII стст. як непасрэдна з германскіх моў, так і праз старапольскую мову, прыводзяцца паралелі адпаведных адзінак у стараўкраінскай і старарускай мовах. Зыходзячы з папярэдніх вынікаў міжнароднага праекта «Мігрыруючыя словы: шляхі нямецкіх запазычанняў з польскай ва ўсходнеславянскія мовы» (кіраўнік – прафесар Альдэнбургскага ўніверсітэта імя Карла фон Асецкага Герд Генчэль), вызначаюцца колькасныя і часавыя параметры такіх слоў, іх распаўсюджанне ў помніках старабеларускага пісьменства на матэрыяле картатэкі і непасрэдна 37 выпускаў выдання «Гістарычны слоўнік беларускай мовы». Звяртаецца ўвага на магчымасць запазычвання германізмаў ста-

**Образец цитирования:**
Прыгодзіч МР. Германізмы ў старабеларускай мове на фоне старапольскай мовы і іх адлюстраванне ў стараўкраінскай і старарускай мовах. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія*. 2022;1:30–39.

**For citation:**
Pryhodzich MR. Germanisms in the Old-Belarusian language against the background of the Old-Polish language and their reflection in the Old-Ukrainian and Old-Russian languages. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2022;1:30–39. Belarusian.

**Автор:**
***Николай Григорьевич Пригодич*** – доктор филологических наук, профессор; заведующий кафедрой белорусского языкознания филологического факультета.

**Author:**
***Mikalai R. Pryhodzich***, doctor of science (philology), full professor; head of the department of Belarusian linguistics, faculty of philology.
*mik197@tut.by*

рарускай мовай праз пасярэдніцтва старабеларускай мовы, указваецца на неабходнасць далейшага даследавання месца і ролі германізмаў у лексічным складзе сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў сувязі з падрыхтоўкай шматтомнага выдання новага тлумачальнага слоўніка.

***Ключавыя словы:*** старабеларуская мова; міжмоўныя кантакты; германізмы; прамое запазычванне; старапольская мова; стараўкраінская мова; стараруская мова; іншамоўныя запазычанні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

# GERMANISMS IN THE OLD-BELARUSIAN LANGUAGE AGAINST THE BACKGROUND OF THE OLD-POLISH LANGUAGE AND THEIR REFLECTION IN THE OLD-UKRAINIAN AND OLD-RUSSIAN LANGUAGES

***M. R. PRYHODZICH***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article examines the original Germanisms borrowed by the Old-Belarusian language during the 14th–18th centuries both directly from the Germanic languages and through the Old-Polish language, the parallels of the corresponding units in the Old-Ukrainian and Old-Russian languages are analysed. Based on the preliminary results of the international project called «Migrating words: ways of German borrowings from Polish to East Slavic languages» (project leader is Professor of the Carl von Ossietzky University of Oldenburg Gerd Hentschel), quantitative and temporal parameters of borrowing such words, their distribution in the monuments of Old-Belarusian writing on the material of the card index and directly 37 issues of «Historical dictionary of Belarusian language» are determined. Attention is drawn to the possibility of borrowing Germanisms by the Old-Russian language through the mediation of the Old-Belarusian language, the need for further research of the place and role of Germanisms in the lexical composition of the modern Belarusian literary language in connection with the preparation of a multi-volume edition of a new explanatory dictionary is indicated.

***Keywords:*** Old-Belarusian language; interlanguage contacts; Germanisms; direct borrowing; Old-Polish language; Old-Ukrainian language; Old-Russian language; foreign borrowings in the modern Belarusian literary language.

## Уводзіны

Працэс запазычвання іншамоўных слоў на працягу ўсёй гісторыі развіцця беларускай мовы адбываўся па-рознаму і непасрэдна залежаў ад сукупнасці многіх фактараў сацыяльна-эканамічнага і культурнага характару. Часта тая ці іншая назва запазычвалася разам з рэаліяй або паняццем, якое яна намінавала, іншым разам – у выніку дзеяння тэндэнцыі да лаканічнасці і моўнай эканоміі, калі запазычанае слова адносілася да безэквівалентнай лексікі, а ў мове-рэцэптары не было аднаслоўнай назвы рэаліі і яе значэнне перадавалася апісальна. Па-рознаму засвойваліся іншамоўныя словы ў жывой народнай гаворцы і літаратурна-кніжным пісьменстве, колькасна нераўнамерна яны прадстаўлены ў лексікаграфічных крыніцах розных эпох, у сферы спецыяльнай тэрміналогіі і інш. Шмат якія з запазычанняў на пэўных этапах моўнай гісторыі выходзілі з ужытку, выцясняліся ўласнамоўнымі лексічна-граматычнымі адпаведнікамі-неалагізмамі, асобныя з сучасных запазычанняў паўторна вярталіся ў беларускую мову з рускай. Некаторыя запазычанні, асабліва ў першыя два дзесяцігоддзі XX ст., свядома ўводзіліся навукоўцамі і літаратарамі ў беларускую мову. Яны выконвалі раней і выконваюць цяпер у ёй не толькі чыста намінатыўную функцыю, але і з’яўляюцца важным лексіка-стылістычным сродкам [1, с. 13]. Па падліках А. М. Булыкі, толькі ў старабеларускай мове зафіксавана каля 4000 самастойных лексічных адзінак іншамоўнага паходжання. Калі ж сюды дабавіць каля 6000 дэрыватаў, то «агульны лік слоў, звязаных сваім паходжаннем з іншамоўным каранясловам, склаў на завяршальным этапе функцыянавання старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы каля 10 000 лексічных адзінак» [2, с. 31].

Навуковае лінгвістычнае асэнсаванне іншамоўных слоў у беларускай мове пачалося толькі ў другой палове XIX ст., і звязана яно з іменем акадэміка Я. Ф. Карскага. Менавіта ў манаграфіі «Беларусы» (1903) ён прывёў значны спіс слоў, што прыйшлі ў беларускую мову з іншых моў пераважна дзякуючы польскаму пасрэдніцтву. У главе V «Белорусы вместе с литовцами под властью Польши. Наплыв разных иностранных слов в белорусское наречие» ён пісаў наступнае: «Немецкие слова отчасти могли быть позаимствованы и самостоятельно у немцев, тогда как белорусы иногда соприкасались с ними непосредственно; кой-какие слова могли зайти от немцев к белорусам и через посредство евреев, о чем речь после…» [3, с. 6].

Пры гэтым Я. Ф. Карскі вылучыў і «слова иностранные, зашедшие в белорусское наречие при посредстве польского языка:

ба́киръ: набакиръ набекрень, пол. **nabakier** из н.-нем. **bakker** (Карлов., 25).

балея большая лохань для мытья белья, пол. **baleja**, **balja** из н.-нем. **Balje**.

ба́лька – бэ́лька балка, пол. **belka** из нем. **Balken**.

«…» бо́хонъ каравай хлеба, пол. **bochen** из нем. **Bache**.

бра́га гуща, остающаяся после выварки водки, известный напиток, пол. **braha** из нем. **Brühe** (Мацен., С. SL., 20).

бракова́ць, пол. **brakować** от **brac** из нем. **Brack**.

бры́жи кружева, известным образом сшитые, пол. **bryży** из нем. **Brise**, **Preis**, **Preise** (Карлов., 69).

бруштынъ и бурштынъянтарь, пол. **bursztyn** из нем. **Bernstein**.

бры́ка, бры́чка, пол. **bryka**, **bryczka**, быть может, из народного нем. **Barutsche**, **Birutsche**, которое в свою очередь из ср.-лат. **Birota** (Карлов., 69).

брукъ камен. мостовая, пол. **bruk** из нем. **Brucke**.

бу́лка белый хлеб, пол. **bulka** из нем. **Beule** (ср. Карлович, 75).

ва́га вес, пол. **waga** из ст. в.-нем. **Wāga**.

ва́рта караул, пол. **warta** из нем. **Warte**.

ва́ртый стоящий, пол. **wart** из нем. **Wart**.

во́рчикъ, пол. **orczyk** из нем. **Ortscheit** (Миклошич (Denkschr., XXXVIII, 7) допускает возможность и восточного происхождения: **orče̥k**, **urče̥k**, **určik**.

гакъ крюк, пол. **hak** из нем. **Hacken**.

га́лы ягодицы, пол. **galy** из нем. **Galle**.

га́ндэль торговля, мена, пол. **handel** из нем. **Handel**.

гвалтъ крик, пол. **gwalt** из нем. **Gewalt**, при посредстве евр. **giewalt**.

ге́бэль пол. **hebel** из нем. **Hobel**.

герцъ, ге́рцикъ знаток, плут, прогерцываць, проматывать, польское старое **herc**, **harc**, из нем. **her zu**. Slownik, II, 16.

гра́баръ землекоп, пол. **grabarz** из нем. **Gräber**.

грунтъ почва, пол. **grunt** из нем. **Grund**.

дахъ крыша (не соломенная), пол. **dach** из нем. **Dach**.

дежа́ (дзежа́), пол. **dzieża**. Карлович (144) ставит в связь с народ. нем. **Döse**, а также Dose. Такого же взгляда и Брюкнер (149). С. і język., 68.

дра́бы кости, пол. **drab**, нем. **Treppe**, прежн. **Trappe**.

дротъ проволока, пол. **drut** из **drot**, нем. **Dragt**.

друкъ, друка́ръ, друка́рня печатня, набойная и т. д., пол. **druk**, **drukarz**, **drukarnia** – все из нем. **Druck**.

дзя́коваць благодарить, переделка пол. **dziękować**; поляки, по Брюкнеру (С. і język., 45), образовали свое слово под влиянием нем. **danken** и чешск. **Dękowati**» [3, с. 6–7].

Варта адзначыць, што першыя лексікаграфічныя фіксацыі запазычаных слоў у беларусаў і ўкраінцаў адносяцца да канца XVI ст., калі ў Вільні ў 1596 г. быў надрукаваны слоўнік Лаўрэнція Зізанія «Лексис сиречъ реченія въкратъце събранны и из словенскаго языка на простый рускій діялектъ истолкованы Л. З.». У рэестравай частцы слоўніка пададзена 1061 слова, у тлумачальнай – больш за 2000. Гэты слоўнік пазней цалкам увайшоў у выданне Памвы Бярынды «Лексикон славенороссийский» (1653).

Некаторыя запазычаныя словы зафіксаваны ў першым навуковым даследаванні аб беларускай мове – артыкуле Канстанціна Калайдовіча «О белорусском наречии»[1], у канцы якога аўтар падаў «Краткий словарь белорусского наречия» з 67 слоў. Сярод іх знаходзім наступныя лексемы: *гвалт* – насилие (з ням. *gewalt*), *ковалок* – кусок (з пол. *kawalek*), *лихтар* – подсвечник (з ням. *Licht* ‘свеча’), *мур* – каменное строение (з лат. *murus*, з ням. *mauer*, у пол. *mur*).

Значная колькасць іншамоўнай лексікі прадстаўлена ў выданні І. І. Насовіча «Словарь белорусского наречия» (1870) і іншых (нешматлікіх) слоўніках XIX ст.

Аднак сапраўднае **філалагічнае даследаванне** іншамоўных запазычанняў у беларускай мове пачалося ў першым выпуску манаграфіі Я. Ф. Карскага «Беларусы». Можна адзначыць таксама, што ў 1920–30-я гг. з’явіліся невялікія артыкулы і нататкі аб этымалогіі беларускіх слоў, рабіліся спробы ахарактарызаваць асобныя групы запазычанняў з іншых моў. Сістэмна гэта работа стала весціся

[1] *Калайдович К.* О белорусском наречии // Тр. о-ва любителей рос. словесности при Имп. Моск. ун-те. 1822. Ч. 1. С. 67–80.

толькі ў канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. у сувязі з планамі падрыхтоўкі гістарычнага слоўніка беларускай мовы, выданне якога завяршылася ў 2017 г. Фактычна першапраходцам у вывучэнні іншамоўнай лексікі ў гэты перыяд стаў прафесар А. І. Жураўскі, назіранні якога над рознымі групамі лексічных запазычанняў былі абагулены ў раздзеле «Запазычаная лексіка ў старабеларускай мове» калектыўнай манаграфіі «Гістарычная лексікалогія беларускай мовы» [4]. У другой палове ХХ ст. да актыўнага вывучэння запазычанняў далучыўся А. М. Булыка [гл., напрыклад, 5].

Што тычыцца вывучэння непасрэдна германізмаў, то яно адбывалася ў сувязі з даследаваннем запазычанняў у цэлым. Колькасныя падлікі лінгвістаў, напрыклад, засведчылі, што ў мове старабеларускага пісьменства **германізмы** займалі *трэцюю пазіцыю*, саступаючы **паланізмам** і **лацінізмам**. Выразна акрэсліліся і два шляхі пранікнення гэтай лексікі: у выніку прамых кантактаў носьбітаў беларускай мовы з нямецкім і часткова яўрэйскім насельніцтвам і праз пасрэдніцтва польскай мовы.

На працягу апошняй трэці ХХ – пачатку ХХІ ст. у навуковым друку з'явілася значная колькасць работ, прысвечаных германізмам. Былі абаронены кандыдацкія дысертацыі, апублікаваны цыклы артыкулаў па гісторыі германізмаў як у старабеларускай мове, так і ў мове мастацкіх твораў сучасных аўтараў, прааналізаваны германізмы ў фальклорна-дыялектных запісах ХІХ – першай паловы ХХ ст.

Адзначым таксама, што пытанні запазычвання германізмаў ва ўсходнеславянскіх мовах былі прадметам абмеркавання на тэматычным блоку «Мігрыруючыя словы: германізмы ва ўсходнеславянскіх мовах, якія маюць адпаведнікі ў польскай мове» (мадэратар – прафесар Герд Генчэль) Міжнароднага кангрэса славістаў [6]. Гісторыі даследавання германізмаў у беларускай мове прысвечана таксама манаграфічна-бібліяграфічнае выданне «Германізмы ў беларускай мове» [7].

## Вынікі і іх абмеркаванне

Словы германскага паходжання сталі пранікаць у беларускую мову параўнальна рана. Маючы фактычна цэнтральнаеўрапейскае геаграфічнае становішча, «займаючы самы крайні заходні абшар усходнеславянскай тэрыторыі, беларусы, натуральна, у першую чаргу ўспрымалі лексічныя запазычанні, якія ішлі з захаду» [4, с. 84]. Адным з самых ранніх дакладна датаваных помнікаў старабеларускага пісьменства, у якім была зафіксавана пэўная колькасць слоў іншамоўнага паходжання, у тым ліку германізмаў, з'яўляецца так званая Дагаворная грамата смаленскага князя Мсціслава Давыдавіча з Рыгай і Гоцкім берагам 1229 г. (далей – Грамата 1229 г.). Яна адносіцца да ліку дзяржаўных юрыдычна-гандлёвых дакументаў і ўтрымлівае дагавор паміж смаленскімі, віцебскімі, полацкімі і «лацінскімі» (нямецкімі) купцамі з Рыгі і Гоцкага берага (Готланда). Да нашага часу дайшлі дзве рэдакцыі граматы – рыжская і готландская, кожная ў трох спісах, складзеных на Гоцкім беразе і ў Смаленску. У грамаце, напісанай на мясцовай гаворцы (свабоднай ад уплыву царкоўнаславянскай мовы), прадстаўлены многія важнейшыя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы «будучай беларускай мовы» [8].

У тэксце граматы даследчыкі адзначаюць запазычаныя словы нямецкага (*мыто* ʻпошліна', *фоготъ* ʻсуддзя'), скандынаўскага (*тиоунъ* ʻслужбовая асоба пры князях, баярах, епіскапах') і цюркскага (*ногата* ʻграшовая адзінка, роўная адной дваццатай грыўні') паходжання.

Што тычыцца слоў *мыто* (*...з гочкого берега до смольнеска без мыта*), *тиоунъ* (*аже тиоунъ оуслышить*) і *ногата* (*ногата смольнеская*) [9, с. 34–36], то іх паходжанне не выклікае сумненняў. Сапраўды, лексема *мыто* ўзыходзіць да старажытнаверхненямецкага *Mūta* ʻпошліна за правоз тавараў праз мяжу', *тиоунъ* – да старажытнаісландскага ʻслуга', *ногата* – гэта запазычанне з цюркскіх моў, дзе яно абазначала адпаведную грашовую адзінку.

Складаней атрымліваецца з лексемай *фоготъ*, у навуковай літаратуры яе паходжанне безапеляцыйна звязваецца з нямецкай мовай (у слоўніку да першага тома выдання «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» яно этымалагізуецца нямецкім *Vogt* ʻсуддзя'. Картатэка ж гістарычнага слоўніка беларускай мовы гэту лексему не фіксуе, паколькі Грамата 1229 г. у лік першакрыніц не трапіла. У слоўніках нямецкай мовы слова мае стылістычную памету «гіст.» і падаецца ў значэнні ʻнамеснік, кіраўнік, фогт'. Такім чынам, у тэксце Граматы 1229 г. адлюстравалася, на нашу думку, форма *фоготъ* як унармаваны графіка-фанетычны варыянт – рыса тагачаснай беларускай мовы.

Сведчаннем фанетыка-арфаграфічнай адаптацыі германізма *Biscof* (ад грэч. *episkopos*) можна лічыць і форму *пискоупъ* (*пискоупъ ризкии*), якая ў далейшым у помніках старабеларускага пісьменства будзе дамінаваць на фоне *быскопъ*, *быскупъ* [10, с. 8–10].

Акрамя адзначаных вышэй запазычанняў, у тэксце Граматы 1229 г. адлюстравалася яшчэ адно слова іншамоўнага паходжання – *товаръ* (*възмьть латиньскыи товаръ*; *а что погынеть от того товара…*). Даўняе агульнаславянскае запазычанне з цюркскіх моў (параўн.: тур. *tavar* ʻсвойская рагатая жывёла, скаціна', тое ж у татарскай і туркменскай мовах) першапачаткова мела значэнне ʻскаціна', пазней –

ʽмаёмасць, дабро' > ʽуласнасць' > ʽусялякі тавар'. У тэксце Граматы 1229 г. гэта слова мае абагуленае значэнне ʽпрадукт працы, выраблены для абмену, продажу' [1, с. 14].

І калі ў ранніх помніках беларускага пісьменства германізмы сустракаюцца нячаста, то ў беларускай літаратурна-пісьмовай мове XIV–XVIII стст. адбываецца актыўнае запазычванне слоў германскага паходжання.

Разглядзім **германізмы ў старапольскай і старабеларускай мовах**. Узаемадзеянне старабеларускай і старапольскай моў назіраецца на працягу ўсёй гісторыі станаўлення і развіцця беларускага пісьменства старажытнага перыяду. Асабліва інтэнсіўнымі гэтыя кантакты былі ў XVI–XVII стст., калі ў Вялікім Княстве Літоўскім (пазней Рэчы Паспалітай) фактычна на роўных у розных сферах жыццядзейнасці выкарыстоўваліся абедзве мовы. І толькі ў выніку пастановы Варшаўскага сойма 1696 г. адзінай дзяржаўнай мовай стала польская.

Што тычыцца германскіх моў, то самае ранняе ўзаемадзеянне з імі ў старабеларускім пісьменстве назіраецца ў 1229 г., калі быў заключаны дагавор Смаленска з Рыгай і Гоцкім берагам. Пранікненне германізмаў на першапачатковым этапе дыктавалася як выключна юрыдычнымі акалічнасцямі (неабходнасцю семантычнай трактоўкі асобных тэрмінаў і паняццяў), так і паступовым засваеннем беларусамі новых прадметаў і прылад працы, раней не вядомых мясцоваму насельніцтву. Значная роля ў працэсе засваення германскай лексікі ў беларускай мове належыць старапольскай мове.

Фактычным матэрыялам для прыведзеных ніжэй звестак (табл. 1, 2) паслужылі створаныя ў выніку працы над згаданым міжнародным праектам спецыяльныя слоўнікі-картатэкі германізмаў у старабеларускай, стараўкраінскай і старарускай мовах. Зразумела, што прыведзены матэрыял пакуль не можа прэтэндаваць на ўсебаковую рэпрэзентатыўнасць, яго можна лічыць гіпатэтычным вынікам папярэдняга аналізу гісторыі ранніх германізмаў у аналізуемых мовах.

Табліца 1

**Раннія германізмы ў старабеларускай мове на фоне старапольскай мовы і іх часавае адлюстраванне ў стараўкраінскай і старарускай мовах**

Table 1

**Early Germanisms in the Old-Belarusian language against the background of the Old-Polish language and their time reflection in the Old-Ukrainian and Old-Russian languages**

| № п/п | Лексічная адзінка і яе значэнне ў старабеларускай мове | Старапольская мова | Стараўкраінская мова | | Стараруская мова | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | XIV–XV стст. | XVI–XVII стст. | XI–XVII стст. | XVIII ст. |
| 1 | **Бунтъ** (1538):<br>1) бунт, мяцеж (1566);<br>2) гурт, натоўп (1538);<br>3) пучок, кіпа, стос (1625) | 1746 | – | 1635 | 1648 | 1700 |
| 2 | **Вартовати** (1541):<br>1) злоўжываць (1541);<br>2) вартаваць (1608);<br>3) пільнавацца чаго-небудзь (пачатак XVI ст.);<br>4) чакаць з'яўлення чаго-небудзь (1598) | 1572 | – | 1616 | – | – |
| 3 | **Вахмистръ** (1682):<br>1) ахоўнік, вахмістр | 1764 | – | – | 1598 | 1703 |
| 4 | **Галтаръ** (1631):<br>1) вадасховішча | 1631 | – | – | – | – |
| 5 | **Гуртомъ** (1588):<br>1) оптам (1640);<br>2) гуртам, натоўпам (1588);<br>3) сумесна, разам (1696) | 1773 | – | 1567 | – | Гурт (1763) |
| 6 | **Декаръ** (1563):<br>значэнне няяснае | 1650 | – | – | – | – |

Працяг табл. 1
Continuation table 1

| № п/п | Лексічная адзінка і яе значэнне ў старабеларускай мове | Старапольская мова | Стараўкраінская мова | | Стараруская мова | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | XIV–XV стст. | XVI–XVII стст. | XI–XVII стст. | XVIII ст. |
| 7 | **Дуналь** (1685):<br>1) вялікі (тоўсты) цвік з вушкам<br>**Дынель** (1689):<br>1) кручок на канцы дышля | 1757<br><br>– | – | – | – | – |
| 8 | **Жакгель** (1480 г. – канец XV ст.):<br>1) парус, ветразь | 1532 | – | 1575 | – | – |
| 9 | **Инкгеръ** (1620 г. – пачатак XVII ст.):<br>1) малодшы сын сярэдневякова-га памешчыка | 1874 | – | – | Юнкоръ (1722)<br>Юнкеръ (1734) | Юнкеръ (1720) |
| 10 | **Камердинеръ** (1713):<br>1) камердынер | 1810 | – | – | – | 1707 |
| 11 | **Кипа** (1445):<br>1) мера тавараў, кіпа | 1784 | – | 1550 | 1489 | 1697 |
| 12 | **Кипка** (1686):<br>1) невялікія жалезныя начоўкі | 1953 | – | – | – | – |
| 13 | **Клепачъ** (1516):<br>1) Чаканшчык манеты;<br>2) Мясцовая манета (1685) | 1861 | – | – | – | – |
| 14 | **Кресъ I** (1511*):<br>1) лінія, мяжа, граніца (пачатак XVII ст.);<br>2) канец, заканчэнне (сярэдзіна XVII ст.);<br>3) *перан.* канец жыцця (1588);<br>4) *перан.* мэта, канечны пункт шляху (пачатак XVII ст.);<br>5) *перан.* кульмінацыйны пункт (1615);<br>6) вызначаны тэрмін (1590);<br>7) *перан.* лінія абароны (сярэдзіна XVII ст.);<br>8) шрам, рубец (1699) | 1792 | – | Криса (1613) | Креска (1550) | – |
| 15 | **Норский** (1509):<br>1) галандскае сукно (г. Наардэн) | 1723 | – | – | Норский (1588) | – |
| 16 | **Обшлягъ** (1566)<br>**Абшлягъ** (1602):<br>1) абшлаг | 1791 | – | – | Обшлагъ (1711) | Опшлаг (1703) |
| 17 | **Ратманъ** (1387–1389):<br>1) член Рыжскага магістрата ў XII–XV стст. | 1848 | – | – | Ратман (1284) | 1798 |
| 18 | **Ратуша** (1445, 1385*):<br>**Ратушъ** (1486) | 1462 | Ратушный (1496) | Ратушъ (1559) | Ратушъ (1648) | Ратуша (1699) |
| 19 | **Риса** (пачатак XVI ст. – 1520 г.):<br>1) рыса, лінія | 1737 | – | – | – | – |
| 20 | **Слесакъ** (1686):<br>1) ружэйны затвор (адзін прыклад) | 1841 | – | – | – | – |
| 21 | **Стага** (1686)<br>**Штага** (1699):<br>1) штаг | 1861<br>– | – | – | – | – |

Працяг табл. 1
Continuation table 1

| № п/п | Лексічная адзінка і яе значэнне ў старабеларускай мове | Старапольская мова | Стараўкраінская мова | | Стараруская мова | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | XIV–XV стст. | XVI–XVII стст. | XI–XVII стст. | XVIII ст. |
| 22 | **Сталвага** (1692) (адзін прыклад):<br>1) стальвага | 1778 | – | – | – | – |
| 23 | **Сталь** (пачатак XVI ст. – 1520 г.):<br>1) сталь | 1579 | – | 1565 | 1625 | 1697 |
| 24 | **Сталюга** (1686):<br>1) сталюга | 1857 | – | – | – | – |
| 25 | **Стынка** (1697):<br>1) сняток (рыба) | 1810 | – | – | Снетки (1574) | – |
| 26 | **Стюрман** (1440, 1385*)<br>**Стырманъ** (1627)<br>**Стырникъ** (1582):<br>1) стырнавы (кормчий) | 1555 | – | – | Стюрман (1566) | Стирман (1696) |
| 27 | **Фертмаршалокъ** (1710):<br>1) военачальнік атрада нямецкіх наёмнікаў | 1803 | – | – | Фелтмар-шалъ** (1620) | Фельд-маршелк (1700) |
| 28 | **Фора** (1589):<br>1) плата фурману за перавозку грузаў | 1868 | – | – | – | – |
| 29 | **Фризъ I** (канец XV ст. – 1480 г.*)<br>**Фрызъ** (1580):<br>1) прадстаўнік германскага племені<br>**Фризъ II** (канец XVI – пачатак XVII ст.)<br>**Тризъ** (1489)<br>**Фрезъ** (1580):<br>1) конь-цяжкавоз, ламавік | Не зафіксавана 1564 | – | – | – | – |
| 30 | **Цаля** (1526) (адзін прыклад):<br>1) цаля | 1685 | – | Цаль (1594) | Цолъ (1709)<br>Цоль (1725) | – |
| 31 | **Цына** (1498)<br>**Цынъ** (1511)<br>**Цина** (1510)<br>**Цинъ** (1539)<br>**Ценъ** (1545):<br>1) цынк, вырабы з цынку | 1776 | – | – | – | Цина (1718)<br>Цинк (1738) |
| 32 | **Шалеванье** (1681) (адзін прыклад):<br>1) шаляванне | 1847 | – | – | – | – |
| 33 | **Скалва** (1330*)<br>**Шаля** (1653) | Szala (1490) | – | Шаля (1606) | Скалва (1263) | Шалка (1711) |
| 34 | **Шанокъ** (1571)<br>**Шанка** (1713, 1692*):<br>1) старажытная мера сыпкіх рэчываў | 1657 | – | – | – | – |
| 35 | **Шахта** (1517):<br>1) шахта | 1764 | – | – | Шахта (1645) | – |
| 36 | **Шпилька** (1598):<br>1) шпілька, іголка, калючка | Szpil (1700) | – | Шпиль (1649) | – | – |
| 37 | **Шрубцнокъ** (1577):<br>1) ціскі з вінтавым заціскам | 1863 | – | – | – | – |

Заканчэнне табл. 1
Ending table 1

| № п/п | Лексічная адзінка і яе значэнне ў старабеларускай мове | Старапольская мова | Стараўкраінская мова | | Стараруская мова | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | XIV–XV стст. | XVI–XVII стст. | XI–XVII стст. | XVIII ст. |
| 38 | **Шрубштакъ** (1616):<br>1) ціскі | 1690 | – | – | – | – |
| 39 | **Штурмгабъ** (1567):<br>1) штурмавы шлем з грэбенем і заслонай для вачэй | 1841 | – | – | – | – |
| 40 | **Штурмъ I** (1567):<br>1) шторм<br>**Штурмъ II** (1627):<br>1) штурм | –<br><br>Sztorm<br>(1934) | –<br><br>– | 1565<br><br>– | 1609<br><br>– | 1696<br><br>– |

*Гіпатэтычны год фіксацыі слова. **Форма слова дрэнна расчытваецца ў крыніцы.

Табліца 2

**Прыклады германізмаў, што фіксуюцца толькі ў старабеларускай і старапольскай мовах**

Table 2

**Germanisms recorded only in the Old-Belarusian and Old-Polish languages**

| № п/п | Лексічная адзінка | Час першай фіксацыі ў беларускай мове | Час першай фіксацыі ў польскай мове |
|---|---|---|---|
| 1 | Декаръ | 1563 | 1650 |
| 2 | Дуналь<br>(дынель) | 1685<br>1689 | 1757<br>– |
| 3 | Кипка | 1686 | 1953 |
| 4 | Клепачъ | 1516 | 1861 |
| 5 | Риса | 1520 | 1737 |
| 6 | Слесакъ | 1686 | 1841 |
| 7 | Стага<br>(штага) | 1686<br>1699 | 1861<br>– |
| 8 | Сталвага | 1692 | 1778 |
| 9 | Сталюга | 1686 | 1857 |
| 10 | Фора | 1589 | 1868 |
| 11 | Фризъ I<br>Фризъ II<br>Фризъ<br>Фрезъ | 1480<br>1580<br>1489<br>1580 | *<br>1564<br>–<br>– |
| 12 | Шанокъ | 1571 | 1657 |
| 13 | Шрубцнокъ | 1577 | 1863 |
| 14 | Шрубштакъ | 1616 | 1690 |
| 15 | Штурмгабъ | 1567 | 1841 |
| 16 | Штурмъ<br>(шторм)<br>Штурмъ<br>(штурм) | 1627<br><br>1567 | 1934<br><br>Магчыма ёсць ва ўкраінскай і рускай мовах |

*Час фіксацыі слова невядомы.

## Заключэнне

Сярод 416 германізмаў у помніках старабеларускага пісьменства XIV–XVII стст. 40 адзінак зафіксаваны на 50 і больш гадоў раней, чым яны з'явіліся ў старапольскай мове. Такія словы можна разглядаць як непасрэдныя запазычанні з нямецкай мовы.

Адначасова ў старапольскай і старабеларускай мовах зафіксаваны 93 лексічныя адзінкі (табл. 3).

Таблiца 3

**Адначасовая фіксацыя германізмаў у старабеларускай і старапольскай мовах**

Table 3

**Simultaneous fixation of Germanisms in Old-Belarusian and Old-Polish languages**

| Час фіксацыі слова | Колькасць слоў |
|---|---|
| XIV – мяжа XIV–XV стст. | 5 |
| XV – мяжа XV–XVI стст. | 16 |
| XVI – мяжа XVI–XVII стст. | 53 |
| XVII – пачатак XVIII ст. | 19 |

Запазычаны старапольскай мовай раней, чым яны з'явіліся ў помніках старабеларускага пісьменства, 283 моўныя адзінкі. Гэта можа сведчыць аб польскім пасрэдніцтве.

Што тычыцца сучаснай беларускай мовы, то, паводле «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы», у шасці кнігах налічваецца каля 500 германізмаў з адпаведнікамі ў польскай мове, а гэта амаль 73 % ад іх агульнай колькасці. З улікам наяўнасці больш за 400 германізмаў у «Гістарычным слоўніку беларускай мовы» можна меркаваць, што іх колькасць у старабеларускай мове павінна быць як мінімум у два разы большай (800 ці нават 1000 адзінак) [11, с. 173]. Іншая справа, што далёка не ўсе яны па розных прычынах трапілі ў картатэку «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы», паколькі пры яе стварэнні ў 1960-я гг. многія словы адсутнічалі ў помніках, даступных аўтарам на момант падрыхтоўкі картатэкі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Прыгодзіч АА. Нямецкая мова як крыніца лексічных запазычанняў. *Человек в социокультурном измерении*. 2020;1:12–18.

2. Булыка АМ. Лексіка іншамоўнага паходжання як крыніца гістарычнага слоўніка беларускай мовы. *Мовознавство*. 2015;2:30–36.

3. Карский Е. Белорусы. Введение в изучение языка и народной словесности (вытрымкі). У: Прыгодзіч МР, рэдактар. *Германізмы ў беларускай мове.* Мінск: БДУ; 2015. с. 6–17.

4. Баханькоў АЯ, Жураўскі АІ, Суднік МР, рэдактары. *Гістарычная лексікалогія беларускай мовы.* Мінск: Навука і тэхніка; 1970. 339 с.

5. Булыка А. Германізмы ў старабеларускай мове. *Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. Серыя грамадскіх навук.* 1974;2:76–85.

6. Генчель Г. Мигрирующие слова: германизмы в восточнославянских языках, имеющие соответствия в польском языке. В: Соколовић Д, Милошевић С, уредници. *Мебународни конгрес слависта: тезе и резимеи; 20–27 август 2018 г.; Београд, Србија. Том 1. Језик.* Београд: Чигоја штампа; 2018. с. 289–293.

7. Прыгодзіч МР, рэдактар. *Германізмы ў беларускай мове.* Мінск: БДУ; 2015. 303 с.

8. Анічэнка УВ. Дагаворная грамата смаленскага князя Мсціслава Давыдавіча з Рыгай і Гоцкім берагам 1229 г. У: Міхневіч АЯ, рэдактар. *Беларуская мова. Энцыклапедыя.* Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі; 1994. с. 173.

9. Анічэнка УВ, Вярхоў ПВ, Жураўскі АІ, Рамановіч ЯМ, складальнікі. *Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы. Частка 1.* Мінск: Выдавецтва АН БССР; 1961. 539 с.

10. Жураўскі АІ, рэдактар. *Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Выпуск 2. Биецъ – Варивный.* Мінск: Навука і тэхніка; 1983. 320 с.

11. Прыгодзіч М. Польская мова як пасярэдніца запазычвання слоў нямецкага паходжання ў помніках старабеларускага пісьменства (папярэднія заўвагі). У: Багдановіч ІЭ, Свістунова МІ, рэдактары. *Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі. Зборнік артыкулаў у гонар прафесара Э. Смулковай.* Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ; 2016. с. 170–173.

## References

1. Pryhodzich AA. German language as a source of lexical borrowings. *Human in the Socio-Cultural Dimension.* 2020;1:12–18. Belarusian.

2. Bulyka AM. [Vocabulary of foreign language origin as a source of the historical dictionary of the Belarusian language]. *Movoznavstvo*. 2015;2:30–36. Belarusian.

3. Karskii E. [Belarusians. Introduction to the study of language and folk literature (excerpts)]. In: Pryhodzich MR, editor. *Germanizmy w belaruskaj move* [Germanisms in the Belarusian language]. Minsk: Belarusian State University; 2015. p. 6–17. Russian.

4. Bahan'kow AJa, Zhurawski AI, Sudnik MR, editors. *Gistarychnaja leksikalogija belaruskaj movy* [Historical lexicology of the Belarusian language]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1970. 339 p. Belarusian.

5. Bulyka A. [Germanisms in the Old-Belarusian language]. *Vesci Akadjemii navuk Belaruskaj SSR. Seryja gramadskih navuk.* 1974;2:76–85. Belarusian.

6. Hentschel G. [Migrating words: Germanisms in East Slavic languages that have correspondences in Polish]. In: Sokoloviħ D, Miloševiħ S, editors. *Mebunarodni kongres slavista: teze i rezimei; 20–27 avgust 2018 g.; Beograd, Srbija. Tom 1. Jezik* [International congress of Slavista: these and summary; 2018 August 20–27; Beograd, Serbia. Volume 1. Jezik]. Beograd: Chigoja stamp; 2018. p. 289–293. Russian.

7. Pryhodzich MR, editor. *Germanizmy w belaruskaj move* [Germanisms in the Belarusian language]. Minsk: Belarusian State University; 2015. 303 p. Belarusian.

8. Anichjenka UV. [The Treaty of Smolensk prince Mstislav Davydovich with Riga and the Gothic coast in 1229]. In: Mihnevich AJa, editor. *Belaruskaja mova. Jencyklapedyja* [Belarusian language. Encyclopedia]. Minsk: Belaruskaja jencyklapedyja imja Petrusja Browki; 1994. p. 173. Belarusian.

9. Anichjenka UV, Vjarhow PV, Zhurawski AI, Ramanovich JaM, compilers. *Hrjestamatyja pa gistoryi belaruskaj movy. Chastka 1* [A textbook on the history of the Belarusian language. Part 1]. Minsk: Vydavectva Akademii navuk BSSR; 1961. 539 p. Belarusian.

10. Zhurawski AI, editor. *Gistarychny slownik belaruskaj movy. Vypusk 2. Биецъ – Варивный* [Historical dictionary of the Belarusian language. Issue 2. Биецъ – Варивный]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1983. 320 p. Belarusian.

11. Pryhodzich M. [Polish language as a mediator of borrowing words of German origin in the monuments of Old-Belarusian writing (preliminary remarks)]. In: Bagdanovich IE, Svistunova MI, editors. *Belaruska-pol'skija mownyja, litaraturnyja, gistarychnyja i kul'turnyja suvjazi. Zbornik artykulaw u gonar prafesara Je. Smulkovaj* [Belarusian-Polish linguistic, literary, historical and cultural ties. Collection of articles in honor of professor E. Smulkova]. Minsk: Publishing Centre of Belarusian State University; 2016. p. 170–173. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 24.01.2022.*
*Received by the editorial board 24.01.2022.*